ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА: ЛАКАЛЬНАЕ VS ГЛАБАЛЬНАЕ

ТАЦЦЯНА МАРМЫШ

Анатацыя: Артыкул прысвечаны пытанню трансфармацыі жыццяздольнасці элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны пад уплывам працэсаў мадэрнізацыі. Нематэрыяльная культура ў змененых умовах існавання набыла неабходнасць адказваць на выклікі небяспек сваёй жыццядзейнасці. У артыкуле аналізуюцца найбольш значныя з іх – змена функцый і мадэлей трансляцыі, парушэнне ўнутранай структуры і экалагічнасці бытавання, дэкантэкстуалізацыя і камерцыялізацыя, страта лакальнай унікальнасці нематэрыяльнай спадчыны.

Ключавыя словы: нематэрыяльная культурная спадчына, трансфармацыя, мадэрнізацыя.

INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE: THE LOCAL VS THE GLOBAL

Abstract: The article focuses on transformation of viability of the elements of intangible cultural heritage under the influence of modernization processes. In the changed conditions intangible culture acquired the need to respond to the challenges of its existence. This article analyzes the most significant of them: changing of functions and models of translation, changing of internal structure and ecology of existence, de-contextualization and commercialization, the loss of local uniqueness of intangible heritage.

Keywords: Intangible Cultural Heritage, Transformation, Modernization.

Наступствы шэрагу дастаткова новых для традыцыйнай культуры з'яў у XX стагоддзі паўплывалі на трансфармацыю свядомасці вясковага насельніцтва. Сярод іх – павышэнне сацыяльнай мабільнасці і, адпаведна, дэфармацыя традыцыйнай сацыяльнай іерархіі; масавая міграцыя ў горад; пашырэнне кола сацыяльных кантактаў; пераадоленне іррацыянальнасці быццёвых практык традыцыйнага чалавека праз асвету, навучанне; узнікненне новага тыпу свядомасці, што задаецца індывідуалізмам. Дадзеныя з'явы інспіравалі працэс парушэння лакальных сацыяльных сувязей і лакальных ідэнтычнасцей, што знайшло адлюстраванне ў жыццядзейнасці элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС), якія па прыродзе сваёй з'яўляюцца лакальнымі. У элементах НКС фіксуецца прыналежнасць да прасторава-тэрытарыяльнага локуса быцця носьбіта і імкненне да тэрытарыяльнай ідэнтыфікацыі з ландшафтам бытавання элемента спадчыны.

У пачатку XXI стагоддзя ўзмацняецца пагроза старты элементаў НКС, іх трансфармацыі ў адпаведнасці з новымі абставінамі сацыяльнай і культурнай рэчаіснасцей, якія правакуюцца шэрагам небяспек жыццядзейнасці НКС.[1]

Адбываецца змена функцый НКС або іх пераакцэнтаванне: знікненне ці інтэрыарызацыя сакральнай функцыі і выхад на першы план рэкрэатыўна-забаўляльнай. Пры гэтым губляецца тэсматычны складнік нематэрыяльнай культуры – некрытычнае ўспрыманне, давер і вера ў закладзеныя раней непісаныя правілы і нормы, адсутнасць іх ацэнкі з боку носьбітаў, арыентацыя асобы на мінулае.

Са стратай звыклых функцый нівелюецца і лакальная ўнікальнасць НКС праз "укараненне ў практыку" яе метаўзораў або прыўнясенне ў тэкст элементаў нематэрыяльнай культуры нехарактэрных новаўтварэнняў.

Постфігуратыўная мадэль перадачы НКС змяняецца на канфігуратыўную і прэфігуратыўную. Да дыяхроннай мадэлі трансляцыі дадаецца сінхронная, што прыводзіць да часта некарэктнага ўключэння ў працэс увасаблення НКС знешніх суб'ектаў не звязаных з антрапа-геаграфічным локусам бытавання НКС, а таксама знікнення самаарганізацыі і самарэгуляцыі супольнасці-носьбіта. Апроч гэтага назіраюцца разрывы ў пераемнасці НКС, звязаныя з фарміраваннем новага тыпу сямі – сям'і нуклеарнай, што складаецца з бацькоў і дзяцей або толькі бацькоў. У адрозненне ад трансмісіі інфармацыі ў традыцыйна вялікіх сем'ях у такім кантэксце яна набывае значна карацейшыя тэмпаральныя характарыстыкі.

Асноўны прынцып бытавання НКС – прынцып "тут-і-цяпер" з характэрнай знітаванасцю ў пэўным моманце практыкі НКС мінулага, сучас-

[1] Гаворка вядзецца аб тых формах НКС, якія рэпрэзентуюць традыцыйныя з'явы вясковай культуры.

нага і будучага, на аснове чаго паўстае транстэмпаральнасць такой спадчыны, губляе актуальнасць праз страту вусных каналаў перадачы НКС.

Разбураецца сінкрэтызм складовых частак элементаў спадчыны – страчваюцца з культурнай памяці структурныя элементы; цэльны элемент разбураецца на часткі, якія асобна ўжо не могуць выконваць першапачаткова закладзеныя функцыі.

Часта камерцыйныя інтарэсы становяцца на першае месца ў бытаванні элементаў НКС на працягу доўгага перыяду, і як вынік – павышаная эканамічная каштоўнасць элементаў пачынае прыносіць урон іх жыццяздольнасці: турызм і рамесніцкая вытворчасць становяцца мэтай самі па сабе, у межах выкарыстання традыцыйных тэхналогій ствараюцца выключна папулярныя вырабы, што даюць найбольшы прыбытак супольнасці.

Пашкоджваецца экалагічны модус мыслення носьбітаў спадчыны, які выражае адвечны закон жыцця – гармонію чалавека і прыроды – і праяўляецца ў іх каэвалюцыйным су-быцці. Дысгармонія перастае падтрымліваць сістэму экалагічнай этыкі, якая прадугледжвае выпрацоўку спосабаў рэгуляцыі ўзаемадзеяння носьбітаў спадчыны і ландшафтнага атачэння, дзе носьбіт НКС з'яўляецца кантактным звяном сацыякультурнага і натуральнапрыроднага пачаткаў.

Страчваецца прыродны кампанент экалагічнасці, які заключаецца ў перайманні законаў біялагічнай экалогіі, выражанай у абумоўленасці прыродным атачэннем паходжання многіх элементаў нематэрыяльнай культуры, у звязцы з каторым элементы арганічна развіваюцца, не парушаючы лакальную экасістэму і ландшафт.

У прасторы традыцыйнай культуры чалавек сваім знаходжаннем і дзейнасцю ў пэўным тэрытарыяльным локусе ўплывае на яго існаванне і развіццё; у адпаведнасці са сваімі ўяўленнямі аб рэчаіснасці, уласным светаадчуваннем, падпарадкоўваючы сваім унутраным законам, выбудоўвае адносіны з наваколлем і пераўтварае яго, фарміруе ўнікальны антрапа-геаграфічы локус. І, наадварот, ландшафт уздзейнічае на асобу, што выяўляецца ў залежнасці фізічнага, утылітарнага быцця асобы ад ландшафту (адпаведнасці структуры і формы жылля, схемы рассялення – асаблівасцям рэльефу) і да метафізічных, духоўных праяў, напрыклад, семантычнага "зараду" локусаў ландшафту і пераўтварэнне іх у ландшафтныя топасы, пабудовы сістэмы ўяўленняў аб навакольным асяроддзі ў адпаведнасці з асаблівасцямі ландшафту. Аднак змены ў сацыякультурнай, эканамічнай сітуацыі асабліва ў другой палове XX стагоддзя прывялі да трансфармацыя такіх раўнапраўных суб'ект-суб'ектных адносінаў паміж асобай, нематэрыяльнай культурнай спадчынай і ландшафтам.

Элементы НКС сталі “вырывацца” з традыцыйнага асяроддзя, звыклага ландшафту, тэрыторыі, губляць канкрэтную часавую прымеркаванасць. З такой дэкантэкстуалізацыі ўзнікае негатыўны ўплыў на значэнне элемента ўнутры супольнасці-носьбіта, паніжаецца цікавасць да яго практыкі і пераемнасці.

Такім чынам, у святле апісаных працэсаў статус аксіяматычнай мэты набываюць ахова і захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія прадугледжваюць яе падтрымку і належнае выкарыстанне, што з’яўляюцца вынікам натуральнай дыялектыкі культуры.